общество так разнообразно, что стереотипа доминирующей позиции просто не существует. Возможно, официальная культура будет совпадать со значением национальной культуры.

Для молодежного социума важное значение имеют те формы культуры, которые отвечают его жизненным позициям и ценностным ориентациям.

Упадок нравственности, наблюдаемый в трансформирующемся обществе, не может происходить долгое время. Это же можно сказать по поводу контркультурных молодежных течений, которые социально не приемлемы. Явление аномии в сознании людей сменит консервативно ориентированная ценностная парадигма, которая начнет овладевать большинством социума. Это сформирует тотальное засилье официальной культуры, которое, в свою очередь, породит новые молодежные формы субкультуры.

---

1. *Молодежная* культура и организация досуга молодежи: Учеб.-метод. пособие / Под ред. С. В. Лапиной. — Мн., 2000. — С. 11, 20, 25—29.

2. *Ерасов Б.С.* Социальная культурология: Учебник. — М., 2000. — С. 259.

3. *Салтанович И.П.* Музыка как элемент возрастной субкультуры: Автореф. дис. ... канд. социол. наук. – Мн., 1994. — С. 11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Н.Я.Шалупенка,**
*аспірантка*

## БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ: АСАБЛІВАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ

Нацыянальныя традыцыі – адметная частка культуры нацыі. У іх замацавана тое, што аб'ядноўвае людзей адной

нацыі, кансалідуе іх дзеянні. Нацыянальныя традыцыі, якія складваліся стагоддзямі, забяспечваюць духоўную пераемнасць паміж сучаснікамі, іх папярэднікамі і нашчадкамі, выступаюць гарантам пачуццяў вечнасці, раўнавагі і бяспекі, неабходных чалавеку.

Традыцыі беларускага народа ўзніклі на агульнай усходнеславянскай глебе, але маюць адметныя рысы. Гэтыя рысы звязаны з ладам жыцця беларусаў, ландшафтам, сацыякультурнымі і гістарычнымі ўмовамі, вераваннямі.

На станаўленне і развіццё нацыянальных традыцый беларусаў значны ўплыў аказалі прыродна-геаграфічныя ўмовы. Вядома, што спецыфіка прыроды і клімату кожнай краіны заўсёды аказвае ўплыў на светаўспрыманне народа. Тэрыторыя Беларусі вызначаецца мяккім кліматам, маляўнічым рэльефам з мноствам рэк і азёр, разнастайнасцю глебы, багаццем жывёльнага і расліннага свету, што спрыяе шырокаму рассяленню тут людзей, іх шматлікім гаспадарчым заняткам. Менавіта прырода ў значнай ступені прадвызначыла спецыфіку гаспадарання і ўмовы жыцця насельніцтва. Беларусы пастаянна адчувалі яе ўплыў на жыццё і працу, вымушаны былі ўлічваць асаблівасці свайго прыроднага асяроддзя [1, с. 9], прыстасоўвалі да прыродна-кліматычных умоў свае традыцыі. Аб гэтым сведчыць беларускі народны каляндар — сістэма свят, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзён забарон, што замацаваны ў быце і фальклоры беларускага народа і з'яўляюцца арыенцірам пры выкананні сельскагаспадарчых работ і адпачынку ў гадавым, сезонным і месяцовым цыклах.

Пад уплывам прыродна-геаграфічных фактараў беларусы займаліся ў асноўным сельскагаспадарчай працай, у першую чаргу земляробствам [1, с. 11]. Зямля для беларуса — не проста месца пражывання, яна – фундамент быцця, яго галоўная апора, яго Космас. Наогул, сувязь беларусаў з зямлёй носіць сімбіятычны характар. Беларус успрымае зямлю як жывую і родную яму істоту, абагаяўляе яе. У

беларускай міфалогіі вядомы вобразы Вечарніцы — вечаровай заранкі і Дзянніцы — ранішняй заранкі, Ярылы— бога ўрадлівасці. Багаты беларускі фальклор адлюстроўвае паважлівыя адносіны да прыроды, свяшчэнных гаёў, крыніц. Па глыбіні пантэізму беларусаў можна параўнаць толькі з асобнымі народамі Усходу.

Павага і любоў да зямлі, роднага краю вызначыла тыповую для беларусаў тэндэнцыю паняцця аб Айчыне як архетыпе роднага кутка. Аб гэтым сведчаць песні, казкі, прыказкі і прымаўкі (“У сваім краі, як у раі”, “Кожнаму свой куток мілы,” “Дарагая тая хатка, дзе мяне радзіла матка”).

Пры аналізе ўмоў фарміравання і развіцця беларускіх нацыянальных традыцый нельга не ўлічваць геапалітычнае становішча Беларусі, якая знаходзіцца на перакрыжаванні шляхоў паміж Захадам і Усходам, што спрыяе развіццю яе адносін з іншымі краінамі свету, узаемапранікненню розных культурных традыцый. Гэта аказала ўздзеянне не толькі на яе сацыяльнае становішча, але і на працэс этнічнага развіцця народа.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі беларускі народ зазнаў моцны асімілятарскі ўплыў з боку суседніх краін. Так, у выніку руска-польскіх сутыкненняў у часы праўлення цара Аляксея Міхайлавіча значная частка гарадскога насельніцтва з яго высокаадукаванымі людзьмі і рамеснікамі была гвалтоўна вывезена ў Расію. Беларуская літаратурная мова і элітарны пласт культуры былі надоўга страчаны, але развівалася культура беларускай вёскі. Сведчаннем гэтага з’яўляецца наша багацейшая спадчына, у тым ліку прыказкі і прымаўкі [2, с. 79].

На развіццё беларускіх нацыянальных традыцый аказалі ўздзеянне шматканфесійнасць і многаэтнічны склад насельніцтва, якія канчаткова аформіўся ў эпоху сярэднявечча. З часоў існавання Вялікага княства Літоўскага на землях беларусаў разам з імі жылі літоўцы, рускія, украінцы, палякі, яўрэі, татары, сярод якіх былі распаўсюджаны розныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэлігійныя вераванні. Узаемадзеянне паміж імі не магло не адбіцца на развіцці беларускай культуры, яе традыцый. Прыкладам можа служыць знешняе падабенства беларускіх храмаў праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай канфесій. На падставе аналізу казак, легенд, прыказак, прымавак і іншых фальклорных твораў можна зрабіць выснову аб даволі высокім ўзроўні этнаканфесійнай цярпімасці беларусаў.

Асаблівасці станаўлення і развіцця традыцый беларускага народа звязаны з унікальнай сітуацыяй адначасовага суіснавання язычніцтва і хрысціянства ў перыяд сярэднявечча. Замена язычніцкіх вераванняў хрысціянскімі ў Беларусі расцягнулася на некалькі стагоддзяў, што спрыяла захаванню пад хрысціянскай афарбоўкай язычніцкіх звычаяў, фальклорных і міфалагічных твораў [1, с. 16]. Да нашых дзён у звычаях, абрадах, традыцыях беларусаў прысутнічаюць рысы язычніцтва. Напрыклад, калядныя і купальскія абрады і зараз маюць шмат агульнага з тым, як іх адзначалі нашы продкі ў дахрысціянскія часы. Валачобныя песні, распаўсюджаныя толькі ў беларусаў, звязаны са святам Вялікдзень, якое ў старажытнасці было прысвечана богу Велесу. Шматлікія міфалагічныя істоты язычніцкай міфалогіі (вадзянік, лесавік, гуменнік, хатнік) нярэдка згадваюцца ў беларускіх казках, легендах, паданнях.

Такім чынам, на станаўленне і развіццё беларускіх нацыянальных традыцый прыметна ўздзейнічалі прыродна-геаграфічны, геапалітычны, сацыяльна-эканамічны, рэлігійны фактары. Усе яны ў сукупнасці вызначылі адметныя рысы беларускай культуры, самабытнасць яе традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Дубянецкі Э.С.* Таямніцы народнай душы. — Мн., 1995. — 47 с.

2. *Игнатович П.Г., Чернявская Ю.В.* Этнические основания культуры. — Мн., 2001. — 100 с.